БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

АДРЭС: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29. Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—врана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Паппіска: з даставкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рубл.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб. на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 90. Менск. Аўторак 16 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКІ.

Менская Меськая Управа запрашае арэндатароу меськай зямлі, у каторых срокі кантрактау кончыліся да 1-го студзеня 1918 г. адновіць іх на новых пацьверджаных Управаю умовах.

Член Управы **М. В. Запольскі-Доунар.**
Заведуючы зямельным аддзелам **Э. Полоневіч.**

Будоуніцкі аддзел Менскай Меськай Управы, з мэт падмогі пацярпеушаму ад вайны насяленню, распрадае уласьнікам майстэрняу, хвабрык, заводау, каапэратывау і іншым патрэбіцелям для уласных патрэб **розны жалезны і будоуніцкі матэрыял.**

На рэч пакупкі павінна быць падана у Будоуніцкі Аддзел Управы пісьменая заява с паказаннем прапанованай цаны за купляемае і дзеля якой патрэбнасьці гэта самае куляецца. Прыем заявау што дня ад 12 да 3 гадзіны у дзень.

Агляд рэчэй на прадажу на складзе пры Управе на Юраускай вуліцы і на складзе пры парку конна-жалезный дарогі.

Член Управы
Інжэнэр **В. Цывінскі.**
Загадч. скл. **С. А. Усьціновіч.**

№ 1600/7880.

Менск 16/VII.

Калоніальная вайна.

Зараз будзе 4 годы вайны. У Брэсьце падпісалі мір. Цяпер у Маскве і дальней Расіі і Сыбіры разгараецца новая вайна, у каторай заінтэрэсованы і Англія, Францыя, Амэрыка, Японія з аднаго боку, Цэнтральныя Дзержавы з другога, а бышая Імпэрыя зрабілася падобнай да нейкай колоніяльнай зямлі, у каторай хочуць разгранічыць дзьве сфэры, уліяніа. Доля Вялікаросіі і другіх нацый залежыць ад таго чым кончыцца гэта колоніальная вайна, бо ужо Расія есьць толькі эуропэйска-азіацкая багатая калонія. Наша Беларусія зьвязала сваю судзьбу с Цэнтральнымі Дзержавамі. Яна цяпер перажывае адзін з варыантау, іншэ нізакончанных свaей будучыны.

Можэ быць, той ці другі рэзультат будучаго раздзела Расіі можэ унясьці пэуныя коррэктывы у яе дзержаунае і нацыянальнае самаадзначэнне. Але с кожным днем увесь беларускі народ і уся народная інтэлігэнцыя усе больш і больш да сэрца і розуму прымаець сваю нацыянальна-тэрыторыальную арганізацыю.

С пачатку гаспадарны і асьцярожны беларуткі народ зварочывaець сваі вочы і сваю веру да свайго цэнтральнаго нацыянальнаго органу Беларускай Рады.

Гэта падтрымоувацць іх дух і даець можнасьць выпауняць суменна усе абавязкі, зьвязаныя с цэнжарамі эуропэйскай вайны.

Гэту веру і надзею ні можна нікому адбіраць ад народа. Гэта есьць конкрэтныя рэчы, гэта есьць шчасьлівая комбінацыя. Збурыць легка, а адбудаваць збурэннае ні так проста. Вера і надзея ні могуць быць заменены чым нібудзь мэханічным.

Рэвалюцыя і вайна прабудзілі нацыянальна-краевы патрыотызм, і ен расьцець с кожнымі перэпіціямі усесьветнай драмы. Дыпломаты усяго сьвета можэ быць і вельмі мудрыя людзі, а жывое жыцце народау падносіць ім нісподзеваныя сюрпрызы. Арганізм жывы мэханічным способам нікаму ніудавалося зрабіць.

Палітычныя катаклізмы яшчэ ні закончэны, кругом рушацца торы, ды мацней кожная нацыя, як напрыклад, беларуская, мацней зліваецца у адно нацыянальнае цело, у адну нацыянальную душу. Можэ быць яшчэ многа мелей і падводных скал чакаюць беларускі дзержауны карабель, а мы яшчэ больш загартуемся і выкрысталізуемся і зліемся у адну родную беларускую сямью.

А. У.

Агульныя весткі.

АМСТЭРДАМ, 11/VII. Паводлуг «Дэйлю Ньюс» з Нью-Іорка, у хуткім часе у Злучаных Штатах чэкаюць прыбыцця ангельскаго пасьледніка.

ЛЕНДАН, 11/VII. Лятун майор Мак Гіддэн, кавалер крыжа Вікторыі, каторы тры разы біўся з Іммэльманам, паў.

КАПЭНГАГА, 11/VII. Па поваду дацко-ісляндскіх перэгавораў, паведамляюць, што істнуе мажлівасьць згоды. Абэдзьваімі старанамі зроблены былі уступкі. Па пытанню аб сьцягу, Данія згодзілася на увядзенне Ісляндзіяй ўласнаго сьцягу.

БЭРН, 11/VII. У Жэнэві, па распараджэнню паверанаго швэйцарскаго хаўрусу с прычын сваіх праціўных нэйтралітэту дзеянняў, арэштаваны знаменіты французкі пісьменнік Морыц Гільбо. У Францыі Морыц лічыцца здраднікам.

ГАЛЛЕ. Дырэктар гігіенічнаго інстытуту пры унівэрсытэці Галле, прафэсар Шурман, паведамляе, што пры адным выпадку занядужанні гішпанскім грыпам, яму удалося пасьля доўгіх шуканняў, даказаць аб знаходцы бацыллы інфлюэнцы.

АФІНЫ, 12 гм. французскі генэрал Граснот назначаны начальнікам грэчаскаго штабу.

БЭРН, 11 гм. «Вольф». Штаб арміі паведамляе, што 9 ліпня у швайцарскім войску было 6800 выпадкау гішпанскаго грыппу. З іх 24 скончыліся сьмерцью.

КОПЭНГАГА, 11 гм. Подлуг паведамлення з Гельсінгфорсу, урад запрасіў 10 гм. саймовыя фракцыі на нізвычайне пасядзенне і азнайміу на ім, што ён глядзіць на справу увядзення монархіі як на справу якая павінна разьбірацца габінэтным способам. Рэспублiканцы хочуць плебісціту. Рашэнне гэтай важнай справы чакаецца у канцы тыдня.

Расійска-фінляндская граніца зачынена; асобы, едучыя з Расіі у Фінляндзію павінны адбываць двух тыднёны карантын.

КОУНА, 11, гм. Перавозка варочаючыхся у Расію запынілася. Па паведамленню «Balt hit Mitt» ужо тыдзень як на транспортным пункце каля Пскова савецкі урад ні прыймае транспартау з варочаючыміся. Да гэтаго часу прынящце транспартау і далейшы іх правоз іпці з вялікімі труднасьцямі.

Нямецкі урад стараецца па далей аблегчыць учасьць варочаючыхся.

Весткі з Расіі.

БЭРЛІН, 11 гм. «Voss. Ztg» Расійскі камісар заграпічных спрау, Чычэрын, востра выказауся перад супрацоунікам парыжскаго «Гетря'у» аб замеркаваннях коаліцыі, што да умешання у Сыбіру.

«Для нас німагчыма узнауленне вайны, бо гэто пацягнуло-б за сабой катастрофу для нашых бышых хаурусьнікау, а так сама для нас. Дзеля гэтаго ні допусьцім японскаго умешання ні над якім відам, хаця-б гэто мело выглядаць як помач: першае—ні ведаем чы Японія, заняўшы тэрыторыю, ні затрымае яе; 2-е—ваеннае выступленне Японіі пацягнула-б за сабой ваеннае выступленне Нямеччыны. Прызнанне улады саветау, у залежнасьці ад нашай згоды на умешанне, нас саусім ні цікавіць.

Уступленне Японіі у Сыбір, гвалтам і на перакор волі саветау ні можа быць апраўданым ніякім способам».

БАЗЭЛЬ. 11 гм. Подлуг тэлеграмы с Пецярбургу фінляндскія войскі пачалі наступленне проці Мурманскай дарогі у кірунку Кандалаксы і ад гэтаго пункту знайходзяцца усяго за 50 клм.

МАСКВА. 13 гм. (ПТА). Глаўнакамандуючы процічэхословацкіх войск, Муравьев, будучы членам фракцыі левых с.-р., хацеў здрадніцкім способам павясьці свае войско проціў Масквы для панствоваго пераваpоту. Войско, выключаючы нескольких блізкіх да Муравьева асобаў, адмовілося ад здрады. Дзеля гэтаго ён зьвярнуўся у бок Сімбірска і там арыштаваў мейсцовы савет за нівыпоўненне прыказаў.

Нібы то страціўшы надзею у сваіх праэктах, Муравьев застрэліўся.

МАСКВА, 12 гм. Прэдстаунікі украінскаго ураду згадзіліся на атпору трэцей часьці доўгу, які павінна выплаціць Расія па Берасьцейскаму тракту.

Уражэнні.

II *).

Успамінаецца мне часам другая дарога...

Па шырокім, уежджэным шляху паміж Ленай і Ангарай па гладзі буратскаго сталагор'я, пад'ахвочваная рэзкім падсьвістываннем фурмана—«карыма», [1]) бяжыць ніустаннай рыссію, робячы 10 вёрст у гадзіну, пачтовая пара. Адпатонна, у тахт конскай рысі, бамкаюць падвязныя пад дугу пазванцы. Мягка коціцца па курнай дарозе нігустоўная, але на дзіво моцна скалочаная, пачтовая брычка. Мой спутчык адкінуўся на сядзэнні і упершыся галавой у заднюю сьценку рагожнай буды, сьпіць закачаны доўгай яздой. А я, махінальна чытаючы лічбы на прабягаючых насустрэч тэлеграфных слупах, дзіўлюся з свайго высокаго сядзэння на акаляючы абраз.

Куды ні глянеш на вакол.—здаецца, што ты знайходзісся у самым цэнтры віднай для вока сфэроідамнай паверхні.

І усе сьцяпы, сьцяпы...'

Бедныя расьліннасьцю, высмаленыя слонцам, выедзеныя «кабылкай», [2]) с саланчако-

---

*) Гл. №

[1]) Карымамі завуцца на-поурускія, на-поу бураты, жыхары нікаторых мейсц у Іркуцкай губ. [2]) кабылка—кавалік, конік палявы

..мі белымі п..ямамі, сьцяпы.

Часамі далёка ад дарогі за..ячыць бурацкі улус [3]) і ні ..даеш ці ёсьць у ім жыц.. ці не. Гэто «Зімнік» — ..кінуты на лета гаспадарамі, ..равеўшымі сваё быдло у ..льш прыдатнае для гадоўлі ..эйсцо.

Часамі за прыдарожнай ка..вай прамільгне нівысокі ..ыж, на каторым сквапнымі .. уражэнні вачыма ухопіш ..лусьцертае часам «убіен..ый»...

Пячэ нісьцярпімо слонцо. ..-пад конскіх капытоў, ўзьві..ецца над дарогай і лезе у ..чы і у нос едкі кур. Ні..рыемне, ніустанно дражніць ..ух цьвірканне «кабылкі».

Шпарчэй, шпарчэй бяжыце ..оні!

Рэдка, праз 25—30 вёрст ..ападаюцца вялікія карымскія ..ёлы. Іх ні параўнуеш да на..ай вёскі. Гэто адміністра..ыўныя і гандлёвыя цэнтры ..аскіднаго на вялікім абшары ..асялёння. Часта гладкая вы..гланая мастаўнікам пасярэ..зіне глаўная вуліца. Вялікія, ..вух паверхавыя, з ўселякімі ..рэўлянымі вырэзкамі, домы.

Гэто гнёзды «кулакоў» з ..утэйшых сёлян, альбо, вель..і часта аседлых тут «пася..енцаў», якія заняўшыся ні ..амаваным ніякімі моральнымі ..равіламі гандлем дабраліся да ..ялікаго грошу.

І як на дзіў, чаго саўсім ..іма у нас, с паміж рожна..одных шыльдаў убачым дзе ..ібудзь пад ценню царкоўнаго ..ьвінтара і такі: «Богадѣльня ..мени крестьянина Петра Фи..иповича Аносова», альбо Двухклассная школа имени ..упца 3-й гильдіи Никодима Іннокентьевича Шестопалова».

Ваш фурман пры гэтым ..анечне абернецца да вас і ..аказуючы пугаўём на шыльду і на каменную царкву скажа ..ам, і вы пачуеце воткі гор..асьці у голасе фурмана: — ..здѣсній купец строил» і да..асьць «у скольких тысячах» ..ой купец «ходзіць» альбо ..олькі іх пры сваім жыцці ..еў.

Праўда, ні абміне сказаць ..ры гэтым, што «шибко кру..ой» на грошы быў той фун..атор, але так толькі, без уся..ай нiпрыязьні да яго, бо усё ..с такі свой чалавек быў і ..ез карысьці для свайго, ці ..рыняўшаго яго народу, ні ..амер.

І. Ж.

[3] бурацкая дзярэуня.

ФЭЛЬЕТОН.

«Nie pozwalam»...

Большэвіцкая палітыка са..ая лёгкая палітыка. «Nie ..ozwalam» — і квіта. Бо ..толькі» большэвікі найлепей ..аронюць інтарэсы простаго на..оду, бо толькі большэвікі ма..ць «права» гаварыць ад імя..і працавітай бадматы... А ..раз тое, калі сход рашыць ..зело так, як большэвікі хочуць, дык рашэнне будзець важнае, а калі сход рашыць дзело ні па большэвіцку—дык ні маець гэто рашэнне сілы, і большэвікі ні павінны пазволіць рабіць паводлуг волі сходу, бо... А на гэта «бо»... А на гэта «бо» ёсьць у большэвікоў большэвіцкая вацея і праграма, каторыя важней усяго. Калі нельга большэвіком перад людзьмі выразна прызнацца, як воўк перад ягньом і «бо хочыцца мне жорці», дык трэба хоць дурным, хоць латвавер:ым марочыць галаву уселякімі хітрымі дабаўкамі ды бо: «бо сход пізаконны, пі тыя былі, каму трэба было быць», «бо дапусьцілі на сход буржуяў», «бо»...—і так як у ваўка перад ягньом шмат прычып баламутных.

Воля большасьці—гэта закон для конституціоналістаў, а для большэвікоў—закопам іх вацея і праграма. Воля большасьці—гэта гвалт над меньшасьцю. З такімі аргументамі анархісты здабылі сабе славу, як праціўнікі усякаго гасударства і староннікі жыцця коммуністычнаго. Кожная камуна, можэ у сябе любыя завадзіць парадкі, азначыцца, уселякія па характару могуць падабрацца камуны і і кожны чалавек можэць сабе да спадобы падабраць кумпанію і камуну.

Паміж гасударственнікамі німаж анархістаў.—Яны ідуць сваей дарогай, са сваімі лёзунгамі, аргумэнтамі. Але паміж гасударственнікамі знайшліся соцыялісты уселякіх гатункаў, ды з лёзунгамі, з аргументамі анархістаў. З гэтаго вышла так званая большэвіцкая палітыка, ад каторай німа спакою і ладу для гасударства, для рэспублікі. Вялікая беда ад тых, хто большэвіцкую палітыку праводзіць, але сам чураіцца прызнацца большэвіком. Трэба іх абразуміць, а калі піўдасца—дык змагацца з імі як з большэвікамі.

Э. Б.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Народны Сэкрэтарыят новаго складу, выпауняючы волю Рады уступіу да выканання сваіх абавязкоу.

Адрэс: Захарауская вул. юбілейны дом.

Земскае „безгрошэу'е. Сьмета бабруйскаго павятоваго земства урэзана. Глаунае пацярпела сьмета па народнай асьвеці. Лік школьных камплектау зьменьшано ад 90 да 24.

Косы і сярпы. Губэрнскім земствам камандзіраваны у Кіеу аграном Тымашэнко дзеля закупкі для селян кос і сярпоу.

Політэхнікум. Ад восені адчыняецца у Менску сярэдняя палітэхнічная школа с трэма грунтаунымі спэцыяльнасьцямі: мэханічнаю, будоуніцкаю і культурна-тэхнічнаю. Курс навукі 4 годы. У першы кляс прыймаюцца без экзамэну усе асобы, без розніцы нацыянальнасьці, аканчыушыя вышэйшыя пачатковыя школы або 5 клясы сярэдніх школ. Меськая управа дае для палітэхнікума дом рамесьленай школы. Камплект вучыцелеу ужо набраны. Плата за 1-ое полугодне, с прычын кепскаго становішча земскай кассы—150 р.

Губ. земсабранне асігнавало 15,000 руб. на стыпэндыі, але дзеля нідахвату грошай, пэунасьці у выдачы стыпэндыі німа.

Парада лекароу губ. земства адбылася 5 ліпня па пытанню аб улажэнні прыпынку для асоб, карыстана Пасгэраускай станцыі. Ухвалено: Уладжэнне прыпынку пажаданна і мажліва.

Дзеля праверкі бонавых кніжак заутра, 17-го ліпня—апошні дзень. Ад 18 го ліпня адпуск прадуктау па нiправераным кніжкам спыняецца.

Аднауленне судоу—у вобласьці X арміі, па загаду глаунакамандуючаго устанауляецца зараз жа. Уводзяцца у паветах і у акрузі м. Менску Міравыя суды. Першая істанцыя—міравыя судзьі, другая—павятовыя зьезды міравых судзьей, затым менскі акружны суд с двума аддзеламі пры ім—оппэляцыйным і кассацыйным. Міравымі судзьямі пазначаюцца асобы з юрыдычным сьцяжам, ні маладзейшыя 25 гадоу. Меськая управа, па вымаганню нямецкіх уласьцей, робіць спісак асоб, тасуючыя дзеля заняцця пасад міравых судзьей. Заседацелямі міравых судоу назначаюцца асобы ні малодшыя 25 гадоу, граматныя, пастаянна жывучыя ні меней году у павецi сваіх міравых судоу.

У духоунай семінарыі адбылася парада па пытанню аб сабранні матэрыялау дзеля маючых быць у жніуні епархіяльнаго зьезда духавенства. Семінарыя мае быць перароблена на пастырскія курсы.

Цэны на жытнюю муку у вольнай прадажы у апошнія дні упалі ад 130 р. за пуд—да 100 рублеу. Прычына блізасьць новаго ураджаю і старанне збыць хутчэй астаткі стараго.

Доля безработных патрыотау. Апрача б. кірауніка менскіх нацыяналістау Мэндэля Шоффэра, вандруючаго цяпер у Пецяабурзі у кругах саветау,—там жа мадзеюцца іщчэ двое, толькі буйнейшыя—менскіх патрыогау: о. Околовіч і б. рэдактар «Окраины Россіи» Бываленькевіч. 4-ый менскі платны патрыот Скрынчэнко (б. рэдактар „Минскаго Слова") знаходзіцца у Кіеві.

У губэрнскім прысуствіі, с прычын аднаулення судоу у губэрні, мае быць зачынены судзебны адзел.

Спэктакль і канцэрт, пад кіраунiцтвам Цераускаго, дадзеныя дарэмна 14 гм. у памешканні сэмінарыі прыцягнулі шмат публікі.

Беларускі тэатр.

Сягоння, 16 ліпня, у гарадзкім тэатры беларускі спэктакль. Іграюць «Маньку» Ф. Алехновіча. Гэта ужо трэйцяя пьеса таго-ж самаго аутора, каторую мінчукі пабачуць 1) Калісь, 2) Бутрым Няміра. «Маньку» першы раз ігралі летась у Вільні і там яна мела вялізарны усьпех.

У «Маньцы» праходзяць перад вачыма публікі рад камічных тыпау, і на канве камічных сцэн аутор чырвонай ніткай снуе боль разбітаго сэрца маладой селянскай дзяучыны, каторая нідауна паступіла на службу кэльнэркай у шынок...

Аутор іграе у гэтай пьесе ролю апусьціушагося на дно жыцця пьяніцу—музыку Галубоускага.

Пачатак спэктаклю а $8^1/_2$ гадз. у веч.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 14 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Ма захагнім беразі Ауры увесь дзень напруджонная артылерыйская дзеяльнасьць. У вечары яна ажывілася і на рэшці фронту у зьвязі са стычкамі разведчыкау.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Мейсцовыя бaі каля лесу Віллер—Аоттэрэ. Пасьля сільнай артылерыйскай паугатоукі непрыяцель павеу атаку захадней Шато—Тьерр. Яна была збіта з нансеннем страт ворагу. Ночны руйнуючы агонь часамі ажыулёны.

Пры праясьніўшымся надворы бомбамётчыкі у паветры атакавалі у ночы жалезнадарожныя будовы на французкім ўзбярэжжы паміж Дюнкірхэнам—Булонь—Аббэвіль, на абшары Ліллер—Сэнт Поль—Дулігэн, а так-сама у мейсцовасьці Крэпі ан Валуа і Віллер—Коттэре.

Першы Гепэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Дзяржауны тэатр.

У пятніцу 12 ліпня труппаю артыстаў Беларускаго Дзяржаўнаго тэатру была пастаўлена ў памешканні Гарадзкаго тэатру драма у 2 актах П. Алехновіча «Бутрым Няміра». Заглаўную ролю веў сам аўтор з выдатнай таланавітасьцю. У сваей пьесе ён аглядаецца ў дзіную мінуўшчыну часоў баяршчыны. Злы баярын Бутрым Няміра ні можэ вытрываць анічога, што толькі проці яго характэру—ён катуе усіх, хто пападае на яго вочы, пачынаючы с чэлядзі і канчаючы баярыней—яго жонкаю, якая па сьмерці прыходзіць белай зданню у яго пакой і ні дае яму спачынку. Ен шукае рады і нарабак раіць яму стараго богомольцу, які загадаў баярыну шукаць ратунку у тым, каб збудаваць за усе свае грошы дом Богу, паставіць у дзьвярах яго труну й такім чынам адбываць пакаянне. Няміра выпоўняе гэта і у другім акце перад яго труною праходзяць цені пакрыўджаных ім душаў. Ен усіх перапрашае, апрача сваей жонкі з яе каханкам і праз гэта падае мертвым. Здатным памоцнікам аўтора быў Ф. Ждановіч у ролі старца, кароткай, але патрабуючай вялікай вытрыманасьці і спрыту, якія былі пашым таланавітым артыстаю выказаны, як мае быць.

Пасьля драмы весела прайшла камэдыя нябошчыка К. Каганца «Модны Шляхцюк»; у заглаўнай ролі выдаўся малады артыста В. Пятровіч.

У дывэртысмэнці пекна дэклямавалі маленкія дочкі драматурга Галубка і артыстка Л. Зарніца.

Фіналам вечару быў хор Цераўскаго, артыстычна выканаўшы некалькі беларускіх песьняў. Хор у беларускай адзежы. Соло выступала дзяўчынка, а у другой песьні хлопчык з мінамі натуральных артыстаў. Увесь хор—адна стройная мэлёдыя, с кожным разам ідучая у гару. Шкода толькі што менская публіка відаць ні вельмі нашым штукарствам цікавіцца і нівялічкі збор складаўся, хіба што толькі з сьвядомых беларусаў. У лёжах відаць было з дзесятак палітычных нашых дзеячоў.

Знаемы.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтва **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.